*І.Н.Колабава*
(Мінск)

# Манетныя скарбы ў нумізматычнай калекцыі Віленскага музея старажытнасцей

Нумізматычная калекцыя займала адно з самых значных месцаў у зборах Віленскага музея старажытнасцей. Яна складалася з дзвюх частак – асобныя манеты і манетныя скарбы.

У 1858 г. у нумізматычным зборы музея налічвалася 3247 манет [5, с. 86], у 1866 г. іх колькасць павялічылася да 8110 манет. У выніку рэпрэсіўных мерапрыемстваў, якія разгарнуліся пасля падаўлення паўстання 1863–64 гг., у 1868 г. у Румянцаўскі музей (Масква) вывозяцца 5995 нумізматычных адзінак (18 залатых манет, 3948 срэбраных, 1997 медных, 14 бронзавых медалёў, 18 асігнацый) [1, с. 41]. Тым не менш у 1885 г. нумізматычная калекцыя ўзрастае да 5118 экзэмпляраў (без уліку дублетаў) [3, с. 85–89].

Уяўленне аб нумізматычнай калекцыі музея дае другое выданне “Каталога предметов древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке” 1885 г., у якім прыводзіцца апісанне асобных манет. Гэтае выданне пачынаецца са звароту да чытачоў, у якім адзначаецца, што “музей с благодарностью принимает всякие пожертвования, прямо соответствующие его назначению”, у тым ліку і “древние монеты” [3] .


КАТАЛОГЪ

ПРЕДМЕТОВЪ

МУЗЕЯ ДРЕВНОСТЕЙ,

состоящаго

ПРИ ВИЛЕНСКОЙ ПУБЛИЧНОЙ БИБЛІОТЕКѢ.

ВТОРОЕ ИЗДАНІЕ.

ВИЛЬНА.

Печатано въ типографіи О. С. Блюмовича.

1885.


КАТАЛОГЪ

ПРЕДМЕТОВЪ

МУЗЕЯ ДРЕВНОСТЕЙ,

состоящаго

ПРИ ВИЛЕНСКОЙ ПУБЛИЧНОЙ БИБЛІОТЕКѢ

ДОПОЛНЕНІЕ ПЕРВОЕ

ВИЛЬНА.

1898.

Тытульныя лісты каталогаў Віленскага музея старажытнасцей 1885 і 1898 гг. Фота аўтара

Ва ўводнай частцы каталога ўказваецца, што “для удобства публики… сделаны перед каждым отделом краткие объяснения, предназначенные преимущественно для тех из гг. посетителей, которые по своим занятиям или своему положению не могли приобрести сведений, необходимых при обозрении коллекций Музея” [3, с. 9].

Прадстаўленыя ў каталогу прадметы былі падзелены на азначаныя літарамі ў алфавітным парадку асобныя аддзелы. Нумізматычны збор быў унесены ў “отдел И”.

У 1898 г. выдаецца першае дапаўненне да каталога 1885 г. [4]. Ва ўводным артыкуле да нумізматычнага аддзела адзначаецца, што манеты групуюцца па дзяржаўнай прыналежнасці ў храналагічным парадку. Манетная частка калекцыі складалася з выпадковых прыватных ахвяраванняў. Манетныя скарбы ў большасці паступалі ў музей з Імператарскай археалагічнай камісіі [4, с. 6]. У

каталогу яны размеркаваны па губернях, на тэрыторыі якіх былі знойдзены.

Для сучаснага чытача гэты ўводны артыкул можа быць цікавы толькі як узор тагачаснага ўзроўню развіцця навуковай нумізматыкі.

У гэта выданне ўключаны звесткі аб 38 манетных скарбах, знойдзеных на тэрыторыі васьмі губерняў (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай, Радомскай і Смаленскай) і паступіўшых у зборы Віленскага музея старажытнасцей [4, с. 131–148].

На жаль, каталог 1898 г. мае пэўныя хібы, звязаныя з адсутнасцю шэрагу самых элементарных звестак, напрыклад: няма ўказання на год знаходжання манетных скарбаў, часам манеты не датаваны і г.д. Тым не менш і пры адсутнасці неабходных звестак можна правесці некаторы аналіз прадстаўленых у каталогу скарбаў:

| № п/п | Губерня | Месца знаходжання | Склад скарбу | Колькасць манет | Прыблізнае датаванне скарбу |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Віленская | г. Вільня | ВКЛ, Польшча; медзь | 100 | др. пал. XVII ст. |
| 2 | Віленская | г. Вільня | Расія; медзь | 1599 | XVII ст. |
| 3 | Віленская | в. Красная Дзісненскага пав. | Арабскі Халіфат; срэбра | 62 | X ст. |
| 4 | Віленская | в. Вераб'і, Навіны Лідскага пав. | ВКЛ, Польшча, Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 63 | др. пал. XVII ст. |
| 5 | Віленская | в. Падваранцы Лідскага пав. | Чэхія, Рэч Паспалітая, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 111 | др. пал. XVII ст. |
| 6 | Віленская | в. Балванішкі Ашмянскага пав. | ВКЛ, Шведская Прыбалтыка, Прусія; срэбра, білон | 114 | XVII ст. |
| 7 | Віленская | Ашмянскі пав. | Шведская Прыбалтыка; білон | 62 | др. пал. XVII ст. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Віленская | в. Каўчаны Трокскага пав. | Рэч Паспалітая; медзь | 1276 | др. пал. XVII ст. |
| 9 | Віленская | Невядомае месца | Рэч Паспалітая, Шведская Прыбалтыка, Англія, Германія, ЗША, Нідэрланды; срэбра, білон, медзь | 22 | др. пал. XIX ст. |
| 10 | Віцебская | м. Усвят Веліжскага пав. | Брабант, Расія; срэбра | 102 | пач. XVIII ст. |
| 11 | Віцебская | каля г. Віцебска | Рэч Паспалітая, Расія; срэбра | 159 | XVII ст. |
| 12 | Віцебская | в. Ілока Дзвінскага пав. | ВКЛ, Рэч Паспалітая, Брандэнбург; срэбра | 11 | XVI ст. |
| 13 | Віцебская | в. Унзолы Дзвінскага пав. | Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра | 1261 | XVII ст. |
| 14 | Віцебская | маёнтак Клюкіна Полацкага пав. | Галандыя, Іспанія; срэбра | 15 | XVII ст. |
| 15 | Віцебская | в. Сяляўшчына Полацкага пав. | Рэч Паспалітая, Шведская Прыбалтыка, Прусія; срэбра, білон, медзь | 534 | XVII ст. |
| 16 | Віцебская | в. Кузьміна Себежскага пав. | Расія; срэбра | 38 | пач. XVIII ст. |
| 17 | Віцебская | в. Арэхаў Себежскага пав. | Лівонскі Ордэн; срэбра | 59 | XVI ст. |
| 18 | Віцебская | в. Крыжоў Віцебскага пав. | Расія; медзь | 46 | пач. XIX ст. |
| 19 | Гродзенская | маёнтак Бярозаўка Брэсцкага пав. | Рэч Паспалітая, Германія, Лівонскі Ордэн, Прусія; срэбра, білон | 68 | XVII ст. |
| 20 | Гродзенская | г. Ваўкавыск | ВКЛ, Польшча, Шведская Прыбалтыка, Прусія, Англія; срэбра, білон, медзь | 1370 | XVII ст. |
| 21 | Гродзенская | м. Мсцібаў Ваўкавыскага пав. | Рэч Паспалітая; срэбра, білон | 13 | XVIII ст. |
| 22 | Гродзенская | в. Станялевічы Ваўка- | Рэч Паспалітая, Прусія, Брабант, Ут- | 9 | XVII ст. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | выскага пав. | рэхт, Данцыг; срэбра, білон | | |
| 23 | Гродзенская | Слонімскі пав. | Польшча, Шведская Прыбалтыка | 7 | ? |
| 24 | Гродзенская | м. Домбрава Сакольскага пав. | ВКЛ, Германія, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон | 149 | XVII ст. |
| 25 | Ковенская | м. Салокі Нова-Аляксандраўскага пав. | Бельгія; срэбра | 1 | XVIII ст. |
| 26 | Ковенская | Панявежацкі пав. | ВКЛ, Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 19 | XVII ст. |
| 27 | Ковенская | Шавельскі пав. | ВКЛ; срэбра | 50 | ? |
| 28 | Мінская | в. Якшыцы Ігуменскага пав. | Рэч Паспалітая, Прусія; срэбра, білон | 51 | XVII ст. |
| 29 | Мінская | в. Лецыкоўшчына Мінскага пав. | Арабскі Халіфат; срэбра | 383 | X ст. |
| 30 | Мінская | в. Барыскавічы Мазырскага пав. | ВКЛ, Польшча, Рэч Паспалітая, Расія, Германія, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 158 | XVII ст. |
| 31 | Мінская | м. Крошына Навагрудскага пав. | ВКЛ, Польшча, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон | 134 | XVII ст. |
| 32 | Мінская | застава Прылукі Навагрудскага пав. | ВКЛ, Польшча, Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 148 | XVII ст. |
| 33 | Магілёўская | в. Соў Горацкага пав. | Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка, Англія, Германія; “азіяцкая манета”, срэбра, білон, медзь | 386 | XVII ст. |
| 34 | Магілёўская | в. Крыўліна Магілёўска- | Рэч Паспалітая; срэбра | 15 | XVIII ст. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | га пав. | | | |
| 35 | Магілёўская | в. Звонца Рагачоўскага пав. | Польшча, Бельгія, Германія; срэбра | 9 | XVII ст. |
| 36 | Магілёўская | м. Рэчкі | ВКЛ, Польшча, Прусія, Шведская Прыбалтыка; срэбра, білон, медзь | 102 | XVII ст. |
| 37 | Радомская | в. Сарноў Казеніцкага пав. | Чэхія; срэбра | 19 | XIV ст. |
| 38 | Смаленская | в. Варухі Парэчскага пав. | Расія; срэбра | 336 | XVII ст. |
| | | | Усяго | 9061 | |

Скарбы, прадстаўленыя ў каталогу 1898 г., па сваім складзе характэрны для беларускага рэгіёна і адлюстроўваюць агульную карціну развіцця мясцовай грашовай гаспадаркі на працягу X–XIX стст. [7].

Праводзячы аналіз каталогаў 1885 і 1898 гг. у дачыненні да нумізматычнай калекцыі можна правесці ўдакладненне звестак аб колькасных паказчыках гэтай калекцыі, дапаўняючы іх інфармацыяй аб аб’ёме манет у апісаных манетных скарбах (38 скарбаў каталога 1898 г. складаліся з 9061 экз.).

Трэба адзначыць, што ў каталог уключана меншая частка з тых скарбаў, што ўваходзілі ў фонды музея.

Ёсць звесткі, што на працягу 1855–1915 гг. у музей было перададзена 78 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Віленскай губерні [1, с. 40].

Такім чынам, улічваючы манетныя скарбы з тэрыторыі Віленскай (78), а таксама іншых губерняў па каталогу 1898 г. (29), можна меркаваць, што скарбавая частка нумізматычнай калекцыі Віленскага музея старажытнасцей налічвала больш за 100 дэпазітаў.

1. *Грималаускайте, Д.* Собрание нумизматики Виленского музея древностей / Д.Грималаускайте // Междунар. нумизматическая конф., посвященная 150-летию Национального музея Литвы (Вильнюс, 26–28 апреля 2006 г.) / Национальный музей Литвы. – Вильнюс, 2006. – 238 с.

2. *Гужалоўскі, А.А.* Нараджэнне беларускага музея / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2001. – 124 с.

3. *Каталог* предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке. Второе издание. – Вильна, 1885. – 272 с.

4. *Каталог* предметов музея древностей, состоящего при Виленской публичной библиотеке. Дополнение первое. – Вильна, 1898. – 154 с.

5. *Каханоўскі, Г.А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А.Каханоўскі. – Мн.: Навука, 1984. – 118 с.

6. *Потин, В.М.* Монеты. Клады. Коллекции: очерки нумизматики / В.М.Потин. – СПб.: Искусство-СПБ, 1992. – 303 с.

7. *Рябцевич, В.Н.* Нумизматика Беларуси / В.Н.Рябцевич. – Мн.: Полымя, 1995. – 687 с.